**Білет 5**

**Практычнае заданне.**

**Развіццё культуры ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце вучоных – ураджэнцаў Беларусі, чые навуковыя даследаванні садзейнічалі ўмацаванню абароназдольнасці СССР.
2. Як вы думаеце, чаму серыю карцін аб жахах фашысцкіх канцлагераў Міхаіл Савіцкі назваў "Лічбы на сэрцы"?
3. Якія змены адбываліся ў 1960-1980-ыя гг. у сістэме вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР?
4. З чым, на вашу думку, былі звязаны змены ў сістэме вышэйшай і сярэдняй адукацыі БССР, адлюстраваныя ў табліцы III?

**I. Аб серыі карцін «Лічбы на сэрцы»** *(па матэрыялах БЕЛТА)*

| | |
|---|---|
| <br>М. Савіцкі<br>«Вязень 32815» | Міхаіл Савіцкі - беларускі жывапісец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Улетку 1942 г. патрапіў у палон. Быў вязнем фашысцкіх канцлагераў Дзюсельдорф, Дахау, Бухенвальд. Жахам канцлагераў прысвечаны 16 палотнаў Міхаіла Савіцкага пад назвай "Лічбы на сэрцы" (1974-1980).<br>М. Савіцкі так апісваў мэту серыі "Лічбы на сэрцы": "Сама атмасфера нашага стагоддзя выклікае пякучую трывогу за лёс планеты і чалавека. Кожны з нас у адказе за будучыню. Па прычыне гэтай адказнасці я не маю права маўчаць. Мне прыйшлося быць сведкам жахлівых злачынстваў. І казаць пра іх, выявіць іх сутнасць неабходна. Таму я ўзяўся пісаць серыю карцін пра фашызм "Лічбы на сэрцы", каб у абагульненых вобразах паказаць тое, чаго нельга зразумець ні са слоўных апісанняў, ні з дакументаў. Я не мог не напісаць гэтую серыю. Па-першае, у імя памяці мільёнаў ахвяр, якія загінулі ў канцлагерах. Па-другое, дзеля моладзі, якая нарадзілася пасля вайны і таксама не павінна забыць …"<br>На карціне «Вязень 32815» аўтар адлюстраваў сябе на фоне брамы канцлагера Бухенвальд. На жэтоне, падвешаным на шыі, нумар зняволенага. |

**II. Дасягненні навукоўцаў - ураджэнцаў Беларусі** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі 1917 г.- пачатак XXI ст.» 9 клас)*

У пасляваенныя гады значны ўклад у развіццё навукі ўнеслі В.Ф. Купрэвіч, Я.Б. Зяльдовіч, П.А. Сухі. Васіль Феафілавіч Купрэвіч (1897–1969) — ураджэнец Барысаўскага павета Мінскай губерні (цяпер Смалявіцкі раён), доктар біялагічных навук, прафесар, якога ведалі ва ўсім свеце. Ён абараніў сваю доктарскую дысертацыю ў лістападзе 1941 г. у абложаным германскімі захопнікамі блакадным Ленінградзе, што само па сабе было жыццёвым подзвігам. Асноўнымі напрамкамі

навуковай дзейнасці В. Ф. Купрэвіча ў час яго кіраўніцтва Акадэміяй навук БССР з 1952 па 1969 г. сталі батаніка, глебазнаўства, фізіялогія. Вучоны займаўся філасофскай праблемай жыцця і смерці з пункта гледжання біялогіі, што ставіць яго імя ў адзін шэраг з імёнамі выбітных мысляроў XX ст. Прыклаў шмат намаганняў для аднаўлення даследаванняў у галіне генетыкі, якая першапачаткова прызнавалася ў СССР неперспектыўнай навукай. Яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Адным з галоўных стваральнікаў "савецкага ядзернага шчыта" быў ураджэнец Мінска Якаў Барысавіч Зяльдовіч (1914–1987). Чалавек, які не меў вышэйшай адукацыі, у 25-гадовым узросце стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, самастойна вывучыўшы вышэйшую матэматыку. Гэта ўнікальны выпадак у гісторыі савецкай навукі. Займаўся даследаваннем гарэння пораху пры стварэнні рэактыўных снарадаў для легендарнай «кацюшы». Ён стаў адным са стваральнікаў савецкай атамнай бомбы, выпрабаванне якой было праведзена ў 1949 г. Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні савецкай вадароднай бомбы. Геніяльны вучоны за свае даследаванні стаў тройчы Героем Сацыялістычнай Працы.

Значны ўклад ва ўмацаванне абараназдольнасці СССР унёс ураджэнец Віцебшчыны, савецкі авіяканструктар, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Павел Восіпавіч Сухі (1895–1975). Створаныя пад яго кіраўніцтвам франтавыя бамбавікі, штурмавікі, знішчальнікі знаходзіліся на ўзбраенні Чырвонай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Шэраг унікальных самалётаў са стрэлападобнай і трохкутнай геаметрыяй крыла пад маркай "Су" сталі асновай савецкай авіяцыі, а таксама Ваенна-паветраных сіл Рэспублікі Беларусь.

**III. Развіццё сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў БССР**

| | 1960-я гг. | 1980-я гг. |
|---|---|---|
| Колькасць сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў | 102 | 139 |
| Колькасць навучэнцаў у сярэдніх спецыяльных навучальных установах | 62, 6 тыс. чалавек | 160 тыс. чалавек |
| Колькасць вышэйшых навучальных устаноў | 24 | 33 |
| Колькасць студэнтаў у вышэйшых навучальных установах | 59 тыс. чалавек | 182 тыс.чалавек |